# Змяняць свет да лепшага — справа інжынерыі

Пра эфектыўны вопыт прафарыентацыі навучэнцаў і работу інжынерных класаў — у інтэрв'ю з начальнікам аддзела па адукацыі Наваполацкага гарвыканкама Пятром Апановічам.

— У Беларусі запатрабаванасць на рынку працы інжынерных кадраў з'яўляецца адной з найбольш высокіх, — гаворыць Пётр Адамавіч. — Наваполацк ярка вылучаецца развітым прамысловым сектарам, таму моцныя інжынерныя кадры — сярод безумоўных прыярытэтаў. Горад нацэлены ў тым ліку на павышэнне інвестыцыйнай прывабнасці за кошт укаранення інавацыйных тэхналогій і якаснай падрыхтоўкі кадраў. Ключ да вырашэння гэтай задачы — у інтэграцыі ўстаноў адукацыі ўсіх узроўняў, прамысловых прадпрыемстваў і соцыуму.

**— Стварэнне дзеючай сістэмы падрыхтоўкі будучых інжынерных кадраў у Наваполацку — гісторыя не аднаго года...**

— Гэтая гісторыя напрамую звязана з развіццём профільнага навучання. У 2019 годзе мы дасягнулі поўнага ахопу навучэнцаў 10—11 класаў профільным навучаннем. У 2021-м у рамках рэалізацыі пагаднення паміж гарвыканкамам, ААТ "Нафтан", ПДУ і Наваполацкім дзяржаўным політэхнічным каледжам створаны нафтахімічны кластар. Адкрываюцца першыя нафтахімічныя класы: 8—9 класы супрацоўнічаюць з політэхнічным каледжам, 10-я — з універсітэтам. Усе практычныя заняткі па хіміі праводзяцца на базе хімічных лабараторый названых устаноў. За першы год работы 9-га нафтахімічнага класа 55% выпускнікоў выбралі для далейшага навучання Наваполацкі політэхнічны каледж, 45% сталі навучэнцамі 10-га нафтахімічнага класа.

**— Якім змяненням паспрыяла замацаванне за інжынернымі класамі афіцыйнага статусу?**

— Адразу падрасла матывацыя, бо з'явіліся льготы пры паступленні на інжынерныя спецыяльнасці, запатрабаваныя эканомікай краіны. Наша сяброўства з політэхнічным каледжам працягваецца, разам з тым галоўнымі каардынатарамі і ініцыятарамі ўсіх прафарыентацыйных мерапрыемстваў сталі аддзел па адукацыі гарвыканкама і ПДУ імя Еўфрасінні Полацкай. З 1 верасня 2023 года пачалі работу 2 групы інжынернай накіраванасці ў сярэдняй школе № 12 і гімназіі № 2, куды быў залічаны 31 навучэнец. У нас функцыянуюць 10 інжынерных груп у 6 установах адукацыі, дзе займаецца 155 навучэнцаў. За два гады колькасць будучых інжынераў павялічылася ў 5 разоў.



**— Чым абумоўлены выбар навучэнцаў і іх бацькоў на карысць інжынерных класаў?**

— Па-першае, гэта вялізная заслуга ПДУ на чале з рэктарам Юрыем Раманоўскім. На рэгулярных занятках ва ўніверсітэце навучэнцы знаёмяцца з факультэтамі, лабараторыямі, навукова-тэхналагічным паркам. Для 11-х класаў частка заняткаў праводзіцца на ваеннай кафедры, якая таксама ажыццяўляе падрыхтоўку па 4 спецыяльнасцях інжынерна-тэхнічнага профілю. Па-другое, вялікае значэнне мае цеснае супрацоўніцтва з прамысловымі прадпрыемствамі і арганізацыямі — заказчыкамі кадраў. Гэта дае магчымасць умацаваць сувязі выпускнікоў з іх будучымі работадаўцамі, павялічыць зацікаўленасць навучэнцаў у заключэнні дагавораў на мэтавую падрыхтоўку.

**— Якую ролю ў гэтай сістэме адыграў праведзены ў лістападзе 2025 года ў Наваполацку першы абласны форум класаў інжынернай накіраванасці?**

— Я сказаў бы, стратэгічную. Суарганізатарамі маштабнага мерапрыемства на базе ПДУ выступілі галоўнае ўпраўленне па адукацыі Віцебскага аблвыканкама і Віцебскі абласны інстытут развіцця адукацыі. Праграма ўключала брыфінг аб асаблівасцях уступнай кампаніі 2026 года, праведзены асабіста рэктарам універсітэта, — абітурыенты з першых вуснаў атрымалі каштоўную і вельмі дэталёвую інфармацыю. Сярод удзельнікаў інтэрактыўнай выставы-прэзентацыі інавацыйных прадпрыемстваў і арганізацый вобласці былі такія гіганты, як "Нафтан", Полацкі малочны камбінат, Аршанскі інструментальны завод, Віцебскаблгаз і Віцебскводаканал.

**— Магчымасць праявіць сябе ў актыўнай дзейнасці па профілі ў пазаўрочны час — дзейсны стымул для навучэнцаў класаў прафесійнай накіраванасці. Як гэта працуе на канкрэтных прыкладах? Якія дасягненні ў будучых інжынераў з Наваполацка?**

— Неад'емнай часткай работы з інжынернымі групамі з'яўляецца творчая дзейнасць, што дае магчымасць найбольш дакладна ўявіць прафесію інжынера. Так, запамінальнай падзеяй стаў конкурс касплэяў савецкіх плакатаў. Навучэнцы пад кіраўніцтвам педагогаў не толькі прадэманстравалі свае навыкі ў стварэнні вобразаў, але і паглыбіліся ў захапляльны свет, дзе аб'яднаны творчасць, інжынернае мысленне і камандны дух.

Нельга не сказаць пра дасягненні нашых будучых інжынераў на прадметных алімпіядах. Самы высокі вынік тут у Дзяніса Вістунова з сярэдняй школы № 12: бронзавы медаль на 66-й Міжнароднай матэматычнай алімпіядзе ў Аўстраліі і зусім нядаўна — залаты медаль на XVII Міжнародным турніры юных матэматыкаў у Арменіі. Рэсурснымі платформамі для падрыхтоўкі высокаматываваных навучэнцаў да ўдзелу ў алімпіядах, канферэнцыях і іншых мерапрыемствах конкурснага характару выступаюць два інжынерна-тэхнічныя цэнтры, якія функцыянуюць на базе сярэдняй школы № 12 і дыгітальнага цэнтра "IT-акадэмія "Нота".

**— Якая статыстыка паступлення выпускнікоў інжынерных класаў ва ўстановы вышэйшай адукацыі на профільныя спецыяльнасці?**

— У 2025 годзе гэты паказчык у нас склаў 90%, прычым кожны чацвёрты выпускнік стаў студэнтам ПДУ. Вядома, вынікам мы задаволены. Па водзывах, задаволены і нашы выпускнікі разам з іх бацькамі. Сёння інжынерныя класы — не проста трэнд, гэта неабходнасць. А вядомы дэвіз наваполацкіх інжынераў "Змяняць свет да лепшага — справа інжынерыі!" яшчэ раз падкрэслівае важнасць нашых дзеянняў і рашэнняў у павышэнні якасці прафесійнай адукацыі.

**Гутарыла Таццяна БОНДАРАВА.**

**Фота прадастаўлена аддзелам па адукацыі Наваполацкага гарвыканкама.**